# Удзячнай памяці нашчадкаў

Чамерукоў А. С.
Навуковы кіраўнік канд. гіст. навук, дацэнт Шыбалка В. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Незлічонымі матэрыяльнымі стратамі, пылаючымі гарадамі і вёскамі, неймавернымі людскімі пакутамі і мільёнамі заўчасна абарваных чалавечых жыццяў увайшла ў нашу гісторыю Вялікая Айчынная вайна. 22 чэрвеня 1941 г., у нядзелю, стаяў спякотны летні дзень. Магіляўчане адпраўляліся адпачываць на Дняпро. Моладзь рыхтавалася да фізкультурнага парада. У 12 гадзін па радыё перадалі ўрадавае паведамленне аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на СССР. Пачатак вайны быў надзвычай цяжкі. За 12 дзён вайны гітлераўцы здолелі прайсці ад Брэста да Бярэзіны і нават перайсці яе. У міжрэччы Бярэзіны і Дняпра (за 35 – 50 км ад Магілёва) яны сутыкнуліся з войскамі 172-й стралковай дывізіі (генерал-маёр М.Ц. Раманаў). 3 ліпеня яе разведвальныя атрады, якімі камандавалі капітан М.В. Мяцельскі і старшы лейтэнант А.П. Ваўчок, уступілі ў сустрэчныя баі з перадавымі падраздзяленнямі гітлераўскага 46-га танкавага корпуса 2-й танкавай групы Гудэрыяна. Савецкія воіны знішчылі 14 танкаў і каля роты варожай пяхоты. 5 ліпеня камандзір артдывізіёна Б.Л. Хігрын, што замяніў параненага наводчыка, асабіста знішчыў яшчэ 6 танкаў. На цэлыя суткі затрымалі воіны гітлераўцаў на гэтым участку. Так пачалася абарона Магілёва, якая доўжылася 23 дні: з 3 да 26 ліпеня 1941 г. Абарона Магілёва праводзілася часцямі 61-га стралковага корпуса (генерал-маёр Ф.А. Бакунін) 13-й арміі (генерал-лейтэнант П.М. Філатаў, з 09.07.1941 г. генерал-лейтэнант Ф.М. Рэмізаў, з 14.07.1941 г. генерал-лейтэнант В.П. Герасіменка) Заходняга фронту і апалчэнцамі 3 – 26 ліпеня. На абарончых работах вакол горада з 26 чэрвеня да 10 ліпеня штодзённа працавала ад 30 да 40 тысяч гараджан і жыхароў навакольных вёсак. За кароткі тэрмін быў выкапаны процітанкавы роў больш як на 25 км, пабудаваны бліндажы, дзоты, траншэі і эскарпы, пастаўлены мінныя проціпяхотныя і процітанкавыя палі, на некаторых вуліцах – барыкады, у асобных дамах абсталяваны артылерыйскія і кулямётныя агнявыя кропкі, у сценах прабіты

байніцы. На прадпрыемстах, ва ўстановах і навучальных установах фарміраваліся атрады народнага апалчэння. У адпаведнасці з планам непасрэдная абарона горада ўскладалася на 172-ю стралковую дывізію (генерал-маёр М.Ц. Раманаў). У баях каля в. Чачэвічы і г.п. Бялынічы савецкія воіны знішчылі 14 танкаў і каля роты варожай пяхоты. 5 ліпеня камандзір артдывізіёна капітан Б.Л. Хігрын, які замяніў параненага наводчыка, асабіста знішчыў 6 варожых танкаў; прасоўванне варожых войск на гэтым участку было затрымана на суткі. З кожным днём праціўнік узмацняў націск, горад падвяргаўся шматлікім бамбардзіроўкам. У час 14-гадзіннага бою на Буйніцкім полі было падбіта, спалена бутэлькамі з гаручай сумессю і падарвана на мінах 39 танкаў і бронетранспарцёраў, знішчана больш за батальён салдат і афіцэраў праціўніка; каля в. Сідаравічы воіны 747-га стралковага палка знішчылі 20 танкаў і бронетранспарцёраў і больш за роту гітлераўцаў. За 10 дзён баёў, паводле звестак штаба 172-й дывізіі, адбіта 27 варожых атак, падбіта і спалена 179 танкаў і бронетранспарцёраў, захоплены 2 танкі, 12 мінамётаў, 25 кулямётаў, узята ў палон 600 і знішчана не менш як 4 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. 14 ліпеня дывізія страціла сувязь са штабам корпуса, пасля захопу ворагам г. Чавусы спыніўся падвоз боепрыпасаў, харчоў і медыкаментаў, абаронцы горада апынуліся ў аператыўным акружэнні. На паўночны захад, захад, паўднёвы захад ад горада гітлераўцы захапілі вёскі Буйнічы, Цішоўка, Зацішша, Казіміраўка, Пашкава, Гаі, Мікалаеўка, Палыкавічы, на ўсходнім беразе Дняпра – Халмы, Лупалава, Грабянёва і інш. 24 ліпеня праціўнік прарваўся на ўскраіны Магілёва, вулічныя баі адбываліся каля дняпроўскага маста, чыгуначнага вакзала, станцыі Магілёў Таварны, фабрыкі штучнага шоўку і інш. Воіны і апалчэнцы адхілілі ўльтыматум захопнікаў аб капітуляцыі і вырашылі з баямі выходзіць з акружэння. У ноч на 26 ліпеня воіны 388-га стралковага палка з прыдадзенымі часцямі і падраздзяленнямі прарваліся з Магілёва на Захад, воіны 747-га, 394-га і зводнага палкоў – на Усход і за раку Сож, злучыліся з часцямі савецкай 13-й арміі. 23-дзённымі баямі савецкія воіны і апалчэнцы скавалі буйныя сілы ворага ў перыяд Смаленскай бітвы 1941 г. і нанеслі значныя страты ўдарным сілам нямецкай групы армій «Цэнтр».